# Калейдаскоп

ліпень - жнівень 2022

**Школьная газета №10 (40)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову



**Роднае слова. Яно ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці яшчэ ў маленстве. У ціхім журчанні матчыных песень-калыханак, у яе пяшчотных ласках мы пачынаем улоўліваць яго своеасаблівыя формы і гучанне.**

**Потым у бесклапотным дзяцінстве яно ўводзіць нас у дзівосны навакольны свет. Як чароўны ключ, адкрывае нам роднае слова разнастайныя цуды і таямніцы жыцця, уносіць нас у прывабную і захапляючую далячынь падзей у бабульчыных казках і легендах.**

**Затым у школе мы сустракаемся з ім на старонках кніг. Клапатлівыя настаўнікі расчыняюць перад намі дзверы ў гэтае бяскрайняе мора родных слоў. Па яго прасторах мы накіроўваемся ў далёкія вандраванні. Перад намі паўстае наша вялікая краіна. Мы чуем шум яе гарадоў, магутны гул нашык фабрык, заводаў і электрастанцый. Мы ўглядаемся ў прасторы калгасных палёў, у далёкія абшары лясоў. За бясконцымі шарэнгамі родных слоў у кнігах перад нашым зрокам праходзіць уся зямля, яе разнастайная прырода, яе шматвяковая гісторыя, розныя народы, іх звычаі і лёс.**

**Пасля мы забіраемся ў бяздонныя глыбіні гэтага мора слоў, адкрываючы там багацейшыя скарбніцы думак нашага народа, яго культуры. Мы ўваходзім у велічныя палацы навукі, дзе за разнастайнымі спалучэннямі слоў паступова ўлоўліваем усю складанасць і бясконцасць сусвету, захапляемся магутнасцю і вынаходлівасцю розуму людзей.**

**Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова. Яно то ласкавае і пяшчотнае, як подых летняга ветру, то шырокае і плаўнае, як далячынь палёў і азёрныя блакіты, то звонкае і пералівістае, як празрыстыя крыніцы і песні птушак, то суровае і грознае, як навальнічныя хмары *(А. Крывіцкі)* .**



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**ліпень - жнівень 2022**

**Ліпень – цёплага лета зеніт**

***У сукенцы каляровай,***
***У хусцінцы васільковай***
***Ходзіць лета па палях,***
***Па расквечаных лугах,***
***Звоніць песняй жаўруковай,***
***Кожны дзень званчэйшай, новай.***
***Дбайна сонечнае лета***
***Спеліць ягады для дзетак.***
***Любіць з імі забаўляцца,***
***Загараць, спяваць, купацца.***
***Дораць дзеці лету ўсмешкі,***
***Гульні, песні і пацешкі,***
***А расчуленае лета***
***Дорыць ім букеты кветак. Н. Галіноўская***

**Ліпень – самы цёплы месяц года**. Гэта макаўка лета, свята сонца, чырвонае лета, калі *варыць, парыць, дыхнуць не дае*, яго сярэдзіна: справа – лета і злева – лета. Толькі што мінулі самыя кароткія ночы, калі зара з зарой сыходзіцца, бо вячэрняя непрыкметна пераходзіць у ранішнюю. Ліпеньская раніца надыходзіць сапраўды рана. Сонца паступова паварочвае да зімы, а лета – да гарачыні.

У поўдзень на бляклым выцвілым небе аніяк не можа скрануцца з месца спякотнае сонца. Яно нібы замерла. Усё вакол патанула ў нерухомым і сляпучым бляску. Паветра плавіцца ад гарачыні. Разамлела зямля, быццам выхаплены з печы бохан хлеба, дыхае жарам. На дрэвах і кустах не варухнецца ні лісцік, ні галінка. Паніклі лопухі і крапіва, абвяў бульбоўнік. Пазбіраліся бліжэй да рэчкі жабы, пахаваліся ў гнёздах буслы. У цяньку разяўленымі дзюбамі хекаюць асалавелыя куры. Сабакі, высалапіўшы язык, не тое што брахаць, лянуюцца варухнуць хвастом.

Як ні дзіўна, але ліпень і самы дажджлівы месяц. Дождж праходзіць часцей у выглядзе кароценькіх, але моцных ліўняў. Дзень пакрыху меншае, але цяпло не спадае. *Ліпень гаручы, але даручы* – заўважае прыказка.



# Народныя традыцыі



**Адкуль пайшла назва месяца?**
***Пад вечар ліпы зацвілі.***
***Куды да іх язміну й ружы –***
***Па ўсім сяле, па ўсёй зямлі***
***Непераможны водар кружыць.***
***Суквецяў вабных – незлічона,***
***А ў іх нектар, як мёд, густы.***
***І залатыя вязнуць пчолы***
***У жоўтым водары крутым.***
***І ў ціхай вёсачцы палескай***
***Ліповы дух у цэлафан***
***Збірае цётка з хісткіх лесак...***
***Ёй ліпень твар зацалаваў. Хв. Гурыновіч***

**Ліпень – другі месяц лета**. Даўно адцвілі сады, дрэвы пакрыліся густым зялёным лісцем. І раптам у тых жа садах, парках, нават на вуліцах зноў пачынае панаваць непаўторны водар кветак. Гэта закрасавалі ліпы. Надышла пара нарыхтоўкі на зіму лекавага ліпавага цвету, таму і празвалі месяц *ліпецам, ліпенем.* У гэты ж час пачынаюць соты заліваць, мёдам запасацца, і ў ліпеня новае найменне – *пасечнік.* Шмат работы ў ліпені: трэба касіць і грэбці сена, збіраць ураджай, таму звалі яго яшчэ *сенаставам і страднікам;* за частыя навальніцы і жар – *навальнічнікам*, *жарнікам*; шчодры на дажджы, а значыць, і на грыбы, таму – *грыбасей.*

**Ліпеньскія прыкметы**

- Кветкі мацней пахнуць перад дажджом.
- Ластаўкі нізка лётаюць – будзе дождж.
- Глухі гром – да ціхага дажджу, гулкі – да навальніцы.
- Калі на Самсона (10.07) дождж – сем тыдняў дождж.
- Духата пасля поўдня – будзе навальніца.
- Вячэрняя раса ў ліпені – да яснай раніцы.



# Народныя традыцыі



Месяц **жнівень** у народным календары вызначаецца шматлікімі святамі сельскагаспадарчай тэматыкі. І не дзіва, бо гэта той самы месяц, які «год корміць». Так у жніўні (радзей з канца ліпеня) спраўляюцца зажынкі і дажынкі – комплексныя абрады, прымеркаваныя да пачатку і заканчэнню ўборкі палёў. Дажыначны сноп – сімвал свята – будзе стаяць на покуце да наступнага года.

**2 жніўня** (20 ліпеня па грыгарыянскім календары) адзначаўся Ілля (Галляш). Апякун земляробства, які ўспрымаецца як канец лета: “Прыйшоў Пятрок – сарваў лісток, прыйшоў Ілля – сарваў два”, “Ілля нарабіў гнілля”, “На Ілллю да абеда лета, а пасля абеда восень”.

**14 жніўня** (1.08) Макавей (Макава, Макаўе, Першы Спас, Спас Мядовік, Медзяны Спас). Свята маку і мёду. На яго праводзілі абрады з макам, ужывалі ў ежу, рабілі варэнікі з мёдам. Асвячалі ваду, зёлкі, садовыя кветкі, моркву, сланечнік. Елі пірагі з макам і морквою. Ведалі: на Макавея трэба ўволю наесціся маку. Варажылі: “Макавею, Макавею, я на цябе канапелькі сею. Скажы мне, Макавею, дзе мая пара, каб я з ім у гэтую ноч канапельку брала”. Пчалаводы правяралі пчол, “макалі ў мёд нажы”. Існавалі прыкметы: “Як на Юр’я дождж – будзе рыбы многа, а на Макава – будзе многа грыбоў”. Мядовы Спас – найперш свята пчаляроў. Лічылася, што калі пчаляр у гэты дзень не асвеціць крыху мёду ў царкве, то суседскія пчолы «выцягнуць» у яго ўвесь мёд. Казалі таксама, што той, хто нарадзіўся ў гэты дзень, будзе добрым пчаляром.

Поле і агарод ужо ладна-такі кармілі сялянскую сям’ю, і другая палова жніўня, нягледзячы на двухтыднёвы пост, які пачынаўся з гэтага дня, празвана была “спасаўкай-ласаўкай”. Раней бытаваў звычай напярэдадні першага Спаса варыць столькі яек, колькі ў двары мужчын. Разбіўшы яйкі, прыглядаліся: у каго паўнейшае – таму наканавана засяваць жыта, каб атрымаўся поўны ўраджай. Звычай аб’яднаў два сімвалы: яйка (зараджэнне новага жыцця) і паўнату (увасабленне дабрабыту, багацця). Шчасліўцу, у якога абодва сімвалы сышліся, нібы даравалася дабратворнасць, і ён мусіў перанесці яе на агульную ніву ў час сяўбы. Першы Спас зваўся ў народзе таксама Макавей, Макаўе. Кожнай гаспадыні трэба было прыгатаваць хоць бы адну страву, якую можна мачаць, – бліны, сачні з «пражанінай» ці з селядцовай жыжкай; пчаляры здабывалі мёд, каб мачаць у яго агуркі і хлеб. На Макавея падкопвалі маладую бульбу і па ёй меркавалі пра ўвесь будучы ўраджай; паспявае мак, шпакі і гракі збіраюцца ў агароды.



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**ліпень - жнівень 2022**

У **жніўні**, але пераважна на Спасаўку, павінна прайсці так званая “Рабінавая ноч” ці “Вераб’іная ноч”. На працягу яе грымоты сатрасаюць неба, грозна бліскаюць маланкі, лье праліўны дождж, дзьме вецер. Згодна з народнымі павер’ямі, у гэту ноч з пекла на свет выходзяць усе злыя сілы, якія нібы спраўляюць сваё галоўнае гадавое свята і страшаць хрышчоных людзей. Паводле іншых меркаванняў, у гэту ноч усе сілы прыроды ядналіся, каб знішчыць “нячыстую сілу”, што пасля Купалля распладзілася за лета і шкодзіла людзям. Забіты ці пакалечаны перуном у “Рабінавую ноч” лічыўся чараўніком.

**15 жніўня** (2.08) **Прачыстая-каталіцкая** (Першая Прачыстая, Першы святок, Зельная). У каталіцкім календары – Унебаўзяцце (Успенне) Божай Маці (уведзена ў VII стагоддзі). Існуе шмат прыказак і прыкмет на гэты дзень: “Прыйшла Прачыста – стала поле чыста”, “Зельная Божая Маці ўсяго можа нам даці”, “Да святка араць – лішнюю капу нажаць”, “Прачыстая прынясе хлеба чыстага”, “Першы Святок і першы світок”. Свецяць зёлкі, кветкі, садавіну, збожжа, што лічацца гаючымі і аберагаючымі.

**19 жніўня** (6.08) **Яблычны Спас** (Спас, Другі Спас, Вялікі Спас, Сярэдні Спас). Свята садавіны. Асвячаюць у царкве яблыкі, пасля чаго іх дазвалялася есці (яны лічыліся грэшнымі пладамі). Згодна Бібліі, змей-спакушальнік праз яблык зрабіў грэшнай Еву. Таму першыя плады неабходна было асвяціць. Асвячалі таксама мёд, каласкі новага ўраджаю. Прыказка нагадвала: “Спас – усяму час”. Пачыналі сеяць азіміну. Наогул лічыцца, што ўжо скончылася лета: “Першы і Другі Спас – бяры рукавіцы ў запас”.

**23 жніўня Дзень Лаўрына.** У гэты дзень глядзелі на ваду ў рэках і азёрах: калі вада ціхая, не хвалюецца, то восень абяцае быць ціхай, лагоднай. Збожжа з поля звезена, а ў селяніна шмат іншых клопатаў, і адзін з іх – як змалоць збожжа новага ўраджаю на муку: “На Лаўрына спяшайся да млына”.

**25 жніўня Фоцій**. Казалі, што пачынаецца так званы чарвівы тыдзень, і пасеянае ў гэты час збожжа дае чарвівую муку. Прыводзілі ў парадак свірны, клеці, гарышчы.

**27 жніўня Дзень Міхея-ціхавея**. У народзе казалі: калі на Міхея вятры моцныя, то чакай непагадзі ў верасні. Калі ж дзень выдаўся гарачым, то зіма будзе марозная. У гэты дзень паляцелі ў вырай жураўлі – то ў сярэдзіне кастрычніка чакаецца мароз, а не – зіма прыйдзе пазней.

**28 жніўня** (15.08) **Прачыстая-праваслаўная** (Успенне, Багародзіца, Першая Прачыстая, Вялікая Прачыстая, Гаспажа, Зялёная, Зельная). Свята ўраджаю і падрыхтоўкі да сяўбы. Асвячалі “бараду” – апошні снапок, зернем якога пасля Прачыстай пачыналі засеўкі, а таксама зёлкі і гародніну. Вядомы прыказкі: “Прыйшла Прачыстая – стала поле чыстае”, “Прачыста – сяўба чыста, а касьба не чыста”. Менш распаўсюджаны наступныя: “Гаспажа – хлеба дзяжа”, “Надышло Успенне – цягні бульбу за карэнне”. Хрысціянская царква адзначае Дзень смерці – Успенне Прасвятой Уладаркі нашай Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі, душу якой без пакут прыняў у царства нябеснае Гасподзь Ісус.

**29 жніўня** (16.08) **Трэці Спас** (Малы Спас, Хлебны Спас, Арэхавы Спас). Адно са свят хлеба. Шмат дзе спраўлялі дажынкі – свята канца жніва. Канец жніва і змена надвор’я адлюстраваны ў прыказках: “Трэці Спас хлеба прыпас”, “Па Трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе”.

# Займальны матэрыял

**Калейдаскоп**
**ліпень - жнівень 2022**

## Цікавыя факты пра беларускую мову

**Толькі ў беларускай мове ёсць літара Ў**

Гэта адметнасць беларускай мовы ўвасоблена ў помніку, які знаходзіцца ў Полацку. Над скульптурай працаваў мастак і дызайнер Ігар Куржалаў. У нізе помніка выбітыя радкі з верша народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна: «Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет».

Толькі ў беларускай мове ёсць літара Ў

Гэта адметнасць беларускай мовы ўвасоблена ў помніку, які знаходзіцца ў Полацку. Над скульптурай працаваў мастак і дызайнер Ігар Куржалаў. У нізе помніка выбітыя радкі з верша народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна: «Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет».

**Беларуская мова знаходзіцца пад пагрозай знікнення**

У паўсядзённых зносінах ёй карыстаецца малы працэнт насельніцтва. Толькі ⅔ беларусаў размаўляе на роднай мове ў побыце. Часцей беларуская мова ўжываецца на дзяржаўных тэле- і радыёканалах, у перыядычных выданнях, справаводстве. Актыўна выкарыстоўвае беларускую мову творчая і навуковая інтэлігенцыя Беларусі.

**Дыялектная мова багацейшая за літаратурную**

Слоўнік літаратурнай беларускай мовы налічвае прыкладна 250 000–500 000 слоў. У дыялектнай мове (агульная назва для гаворак людзей у пэўным рэгіёне) — каля 1,5–2 мільёны слоў.

**Не па-беларуску і не па-руску, а на трасянцы**

Сумесь беларускай і рускай мовы называецца «трасянка». У прамым сэнсе яно абазначае сена нізкай якасці, якое ўтвараецца ад спалучэння сухой і свежаскошанай травы. Ва ўкраінскай мове таксама ёсць падобная з’ява і называецца яна «суржык».

**Для беларускай мовы не характэрны дзеепрыметнікі цяперашняга часу**

Дзеепрыметнікі цяперашняга часу (сплючы чалавек, маючыя дадзеныя)

чужынцы ў беларускай мове. Яны ўжываюцца толькі ва ўстойлівых спалучэннях (бягучы год, дзеючая асоба), характэрных для навуковага і афіцыйнага стыляў. У іншых выпадках гэта парушэнне літаратурнай мовы. Дзеепрыметнікі найбольш распаўсюджаныя ў рускай мове, бо паходзяць з царкоўнаславянскай мовы, на глебе якой і развівалася сучасная літаратурная руская мова. У старабеларускай мове такія формы дзеяслова не былі распаўсюджаныя.

# Займальны матэрыял

**Калейдаскоп**
**ліпень - жнівень 2022**

**Беларуская мова знаходзіцца пад пагрозай знікнення**

У паўсядзённых зносінах ёй карыстаецца малы працэнт насельніцтва. Толькі ⅔ беларусаў размаўляе на роднай мове ў побыце. Часцей беларуская мова ўжываецца на дзяржаўных тэле- і радыёканалах, у перыядычных выданнях, справаводстве. Актыўна выкарыстоўвае беларускую мову творчая і навуковая інтэлігенцыя Беларусі.

**Дыялектная мова багацейшая за літаратурную**

Слоўнік літаратурнай беларускай мовы налічвае прыкладна 250 000–500 000 слоў. У дыялектнай мове (агульная назва для гаворак людзей у пэўным рэгіёне) — каля 1,5–2 мільёны слоў.

**Не па-беларуску і не па-руску, а на трасянцы**

Сумесь беларускай і рускай мовы называецца «трасянка». У прамым сэнсе яно абазначае сена нізкай якасці, якое ўтвараецца ад спалучэння сухой і свежаскошанай травы. Ва ўкраінскай мове таксама ёсць падобная з'ява і называецца яна «суржык».

**Для беларускай мовы не характэрны дзеепрыметнікі цяперашняга часу**

Дзеепрыметнікі цяперашняга часу (сплючы чалавек, маючыя дадзеныя) — чужынцы ў беларускай мове. Яны ўжываюцца толькі ва ўстойлівых спалучэннях (бягучы год, дзеючая асоба), характэрных для навуковага і афіцыйнага стыляў. У іншых выпадках гэта парушэнне літаратурнай мовы. Дзеепрыметнікі найбольш распаўсюджаныя ў рускай мове, бо паходзяць з царкоўнаславянскай мовы, на глебе якой і развівалася сучасная літаратурная руская мова. У старабеларускай мове такія формы дзеяслова не былі распаўсюджаныя.



# Юбілейныя даты





# Юбілейныя даты





# Юбілейныя даты





# Літаратурная старонка



*Янка Купала*

**СПАДЧЫНА**

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.
Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.
Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;
І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пасьбішчы,
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладбішчы.
І ў белы дзень і  чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з'едзены.
Нашу яго ў жывой душы,
Як вечны светач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне свеціць між вандоламі.
Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю. (1918)

# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**ліпень - жнівень 2022**



**Кула́га** – кісла-салодкая страва з жытняй мукі і соладу, мучная каша. Існуе ў дзвюх варыянтах: сапраўдная кулага з калінай і кулага ягадная па-беларуску. Знешне кулага нагадвае густую кашу - яе можна рэзаць нажом. Колер кулагі залацісты, крэмава-ружовы. Падаюць халоднай. Была як будзённай, так і абрадавай, і святочнай стравай. Традыцыйна гатавалі на Івана Купалу.

**Крамбамбу́ля** – беларускі алкагольны напой - настойка на мёдзе і вострых прыправах. П'ецца як халоднай, так і гарачай.





**Рэдактар Юрчанка С.А.**